***Н. А. Ляйко,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# ПРАФЕСІЯ БІБЛІЯТЭКАРА ВАЧЫМА СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ (ФІДК)

Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя змены апошніх дзесяцігоддзяў у Рэспубліцы Беларусь прад`яўляюць новыя патрабаванні да фарміравання асобы спецыяліста. Сучасныя пераўтварэнні ў нашай краіне паўплывалі на інтэнсіўную інфарматызацыю ўсіх сфер дзейнасці. Гэта патрабуе ад спецыялістаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай сферы актывізацыі дзейнасці, арыентацыі ў інфармацыйных масівах і патоках. З кожным годам узрастае роля працэсу збору, перапрацоўкі і захавання інфармацыі, павялічваюцца патрабаванні да эфектыўнага абслугоўвання карыстальнікаў інфармацыі. Таму на сучасным этапе бібліятэчны работнік са спецыяльнай вышэйшай адукацыяй павінен мець не толькі добрыя спецыяльныя веды ў сваёй галіне, але і развіваць такія асобасныя якасці, як імкненне шырыць свой кругагляд, мець грамадзянскую пазіцыю, актыўнасць, самастойнасць, ініцыятыўнасць, гібкасць і нестандартнасць мыслення, навыкі самаадукацыі. Спецыялісты ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці павінны добра ведаць дакументна-інфармацыйныя патокі, умець іх апрацоўваць і прадстаўляць у інфармацыйна-пошукавых сістэмах, ведаць сваіх карыстальнікаў інфармацыі і своечасова выконваць іх запыты з дапамогай выкарыстання сучасных тэхналогій.

Дадзеныя патрабаванні да фарміравання асобы спецыяліста павінны рэалізавацца ў сістэме вышэйшай прафесійнай адукацыі, якая з уключэннем (14 мая 2015 г.) Беларусі ў Балонскі працэс прыводзіцца да стандартаў вышэйшай адукацыі Еўрапейскай прасторы. У гэтай працы значнае месца надаецца павышэнню якасці вышэйшай адукацыі, і сярод важнейшых задач, на нашу думку, мэтазгодна выдзеліць дзве: павышэнне вучэбнай матывацыі студэнтаў і фарміраванне патрэбнасці ў самастойнай рабоце і навыкаў яе выканання. Адпаведна ў мэтах удасканалення вучэбнага працэсу намі было праведзена анкетаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтаў 3 курса на прадмет дакладнага ўяўлення іх адносін да кнігі і прафесіі бібліятэкара, да выкладаемых спецыяльных дысцыплін, асобасных якасцей бібліятэкара, яго адносін да карыстальнікаў інфармацыі і будучай прафесійнай дзейнасці. Найбольшую цікавасць для нас уяўлялі пытанні: «Як вы прыйшлі да прафесіі бібліятэкара?», «Якую ролю ў вашым жыцці адыграла кніга?» – і, вядома, – як яны ўзаемазвязаны. Пры адказе на першае пытанне трэба было выбраць: прызванне, неабходнасць або выпадковасць. Паказальнымі сталі адказы: «прызванне» – 19,5 %; «неабходнасць» – 25 %, «выпадковасць» – 55,5 %. У некаторых адказах не было дакладнага размежавання паняццяў, студэнты як бы іх сумяшчалі. У прыватнасці, адзін са студэнтаў адказаў: «Бібліятэкар – гэта інфармармацыйны работнік. Мы жывём у час інфармацыйных тэхналогій, значыць, такая прафесія – неабходнасць». Адказы «выпадковасць», якія склалі большасць (55,5 %), мяркуем, у значнай ступені тлумачацца зніжэннем сацыяльнага статусу бібліятэчнай прафесіі. Гэта патрабуе ад выкладчыкаў адпаведнай пастаяннай работы са студэнтамі ў час куратарскіх гадзін і пры выкладанні спецыяльных дысцыплін. Трэба акцэнтаваць увагу на станоўчых прыкладах дзейнасці лепшых бібліятэк, вядомых спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы. Звычайна пры заканчэнні ўніверсітэта погляды выпускнікоў змяняюцца ў лепшы бок, яны станоўча адносяцца да сваёй прафесіі.

Хаця не ўсе студэнты звязваюць ролю кнігі з непасрэдным выбарам прафесіі бібліятэкара, але яны вельмі хораша адзываюцца аб ёй: 89 % высока ацанілі кнігу, 5,5% не адказалі на гэтае пытанне, а 5,5 % напісалі «я іх чытаю». Як бачым, большую частку адказаў складаюць такія, як: «кніга навучыла мяне правільна фармуляваць думкі»; «кнігі не толькі дапамагаюць знаходзіць чалавеку пэўную інфармацыю, але і развіваюць духоўныя якасці, даюць магчымасць пазнаваць свет»; «чытаю з дзяцінства, гэта заўсёды дапамагала мне вырашаць праблемы, знайсці адказы на складаныя пытанні»; «кнігі павысілі мой інтэлектуальны ўзровень, развілі і пашырылі мой слоўнікавы запас»; «стала чытаць значна больш, калі паступіла на ФІДК» і г. д.

Пры адказе на пытанне: «Якія прафесіянальныя якасці вы лічыце галоўнымі?» – студэнты засведчылі: яны добра ўяўляюць, што ім спатрэбіцца ў іх будучай рабоце, у першую чаргу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яны падкрэсліваюць, што для работы ў бібліятэцы неабходны «прафесійныя веды» – 55,9 %, «адказнасць» – 11,1 % і інш. Пры гэтым у некаторых выпадках называюць канкрэтныя дысцыпліны: «Каталагізацыя дакументаў», «Бібліятэчныя фонды», «АБІС», веданне замежных моў і інш. Студэнты ў асноўным разумеюць сваё прызначэнне ў будучай прафесійнай дзейнасці і дадзеныя дысцыпліны лічаць неабходнымі пры набыцці прафесійных ведаў.

З цікавасцю аднесліся студэнты да пытання: «Якія асабістыя якасці патрэбны бібліятэкару?». Па 19,4 % студэнтаў назвалі «добразычлівасць» і «цярпенне»; 13,9 % – «спагадлівасць»; 47,3 % – «камунікабельнасць», «дабрату», «разуменне», «ветлівасць», «уважлівасць», «адказнасць», «вынослівасць», «самакантроль», «харызматычнасць», «увага да людзей», пунктуальнасць, уменне хутка адаптавацца да інавацый і інш.

Пры адказе на пытанне: «Што лічыце галоўным: работу з карыстальнікамі інфармацыі ці работу з кнігай?» – толькі 5,6 % аддалі перавагу рабоце з кнігай, а 75 % – рабоце з чытачамі. 19,4 % адназначна разглядаюць гэтае пытанне ва ўзаемасувязі: работа з кнігай неабходны складнік абслугоўвання карыстальнікаў інфармацыі. Гэта сведчыць аб дакладным разуменні студэнтамі свайго прафесійнага прызначэння ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

Аналізуючы пытанне: «Як вы будзеце адносіцца да карыстальнікаў інфармацыі?» – 14 % адказалі, што будуць любіць сваіх чытачоў; 80,4 % – паважаць; 2,8 – цярпець; 2,8 % – пазбягаць.

Безумоўна, самымі цікавымі былі адказы на пытанне: «Што вы лічыце прэстыжным або непрэстыжным у вашай будучай рабоце?». 5,6 % не адказалі на гэтае пытанне; 38,9 % засмучаны зніжэннем сацыяльнага статусу бібліятэчнай прафесіі, нізкай зарплатай, мноствам пісаніны. Нягледзячы на гэта, 55,5 % студэнтаў станоўча адказалі на гэтае пытанне. Яны знайшлі тыя вартасці ў сваёй прафесіі, за што яны яе цэняць, у прыватнасці: «падабаецца работа з людзьмі», «работа з інфармацыяй», «добрая вышэйшая адукацыя», «добрыя ўмовы работы», «пастаяннае папаўненне ведаў», «валоданне камп`ютарам», «аўтаматызацыя бібліятэчнай работы», «інтэлектуальная работа», «магчымасць чытаць і займацца самаадукацыяй» і г. д. Як бачым, большасць нашых студэнтаў бачаць перспек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыву і сваё будучае звязваюць з бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю.

Адказы на пытане: «Што больш за ўсё падабаецца ў будучай рабоце?» – былі вельмі разнастайнымі, але трэба зазначыць, што ў большасці выпадкаў станоўчыя. На жаль, 14 % студэнтаў не знайшлі нічога цікавага ў будучай рабоце і 5,6 % зусім не далі адказу на гэтае пытанне. Станоўчыя адказы вельмі розныя: «праца з людзьмі і кнігамі»; «задавальненне запытаў карыстальнікаў інфармацыі»; «інфармацыйная адукаванасць»; «праца ў бібліятэцы стымулюе больш чытаць, а гэта павышае інтэлектуальны ўзровень, развівае памяць, пашырае веды»; «магчымасць сустракацца з цікавымі людзьмі»; «спакойная цікавая работа з кнігамі, асабліва з рэдкімі выданнямі». Безумоўна, самы цікавы адказ быў такі: «хачу працу ў бібліятэцы выкарыстаць як магчымасць прыўнесці нешта новае, разбудзіць царства «вазонаў і бясформенных вязаных кофт».

На пытанне: «Дзе і кім вы хацелі б працаваць?» – адказы былі неадназначнымі. Толькі 41,7 % студэнтаў жадаюць працаваць у бібліятэках (Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, абласных бібліятэках, школьных і дзіцячых бібліятэках, Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэцы, навукова-тэхнічных бібліятэках прадпрыемстваў, працаваць з электронным каталогам і базамі даных). 11,1 % – яшчэ не вырашылі, а астатнія 47,2 % назвалі самыя розныя прафесіі: юрыста, візажыста, кансультанта, аператара ЭВМ, у кнігарні, архіве, працу харэографа, журналіста, дызайнера, перакладчыка і інш. Як бачым, прафесіі розныя, адны блізкія да працы бібліятэкара, а іншыя належаць зусім далёкім ад бібліятэкі сферам.

На пытанне: «Ці змяніўся ваш погляд на прафесію бібліятэкара пасля вытворчай практыкі?» – 58,1% рэспандэнтаў адказалі: «так, змяніўся»; 25,6 % лічаць, што «нічога не змянілася, менавіта так і ўяўлялася будучая работа»; 16,3 % не адказалі на гэтае пытанне. Не ўсе патлумачылі, у чым заключаецца сутнасць змен у іх поглядах на прафесію, але ў большасці выпадкаў падкрэслілі, што сталі думаць лепш аб сваёй будучай працы. Звяртаюць увагу адказы: «прафесія аказалася больш складанай, чым думалася»; «даведаліся многа новай інфармацыі»; «пацвердзілася думка аб тым, што бібліятэкар павінен быць адукаваным, арыентавацца ў многіх галінах ведаў»; «прафесія стала больш падабацца, аказалася лепшай, чым я думала» і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На жаль, былі і іншыя адказы: «прапаў арэол таямнічасці»; «энтузіязм чытачоў падае»; «бібліятэкі з кожным годам становяцца менш папулярнымі»; «зарплата малая» і інш. Гэта дае падставу больш увагі ў вучэбным працэсе ўдзяляць прафарыентацыйнай працы: займацца ёй са студэнтамі патрабуецца не меней, чым з абітурыентамі.

Апошнія два пытанні, па сутнасці, падводзілі вынікі анкетавання. Так, на пытанне: «Якую ролю ў вашым жыцці адыграла бібліятэка?» – большасць (80,6 %) адказалі «вялікую» і толькі 11,1 % – «ніякую», а 8,3 % зусім не далі адказаў. Сярод станоўчых адказаў былі наступныя: «галоўнае значэнне бібліятэкі заключаецца ў тым, што я паступіла на ФІДК, хачу быць бібліятэкарам», «у школьнай бібліятэцы я набываў веды, працаваў з энцыклапедыямі, а таксама чытаў цікавыя кнігі, якіх не было дома».

Нарэшце завяршальнае пытанне: «Што можна і неабходна змяніць у выкладанні спецыяльных дысцыплін для лепшага авалодання прафесіяй бібліятэкара?». Студэнты падышлі да адказу на яго добрасумленна: толькі 8,3 % не ведалі, што адказаць; 19,5 % адзначылі, што іх усё задавальняе, нічога не трэба мяняць; 50 % прапанавалі павялічыць колькасць практычных заняткаў (у тым ліку 8,3 % канкрэтызавалі – за кошт лекцыйных заняткаў); павялічыць колькасць гадзін па спецыяльных дысцыплінах за кошт няпрофільных дысцыплін – 22,2 %. Сярод студэнцкіх адказаў былі цікавыя прапановы: «у час лекцый шырэй выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі»; «праводзіць прэзентацыі»; «даваць не толькі новыя матэрыялы, але і больш інфармацыі на перспектыву»; «неабходна больш дыялогу са студэнтамі».

Падсумоўваючы, абазначым, што ў вучэбным працэсе патрабуе ўдасканалення з мэтай паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў:

– пастаянна весці інтэнсіўны пошук і ўкараненне інавацыйных форм і метадаў навучання;

– праводзіць выхаваўчую работу з мэтай павышэння вучэбнай матывацыі;

– фарміраваць у студэнтаў уменні і навыкі самастойнай работы;

– праводзіць прафарыентацыйную работу не толькі з абітурыентамі, але і са студэнтамі факультэта;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пры выкладанні спецыяльных дысцыплін прытрымлівацца адпаведнасці іх зместу навейшым дасягненням у галіне навукі і практыкі: укараняць інавацыйныя педагагічныя формы і метады і шырэй выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі ў працэсе выкладання.

***З. К. Лошаковская,***
*кандидат исторических наук, доцент,*
*Дагестанский государственный университет, Россия*

## ГУМАНИСТИЧЕСКАЯ НАПРАВЛЕННОСТЬ СОДЕРЖАНИЯ ОБУЧЕНИЯ СТУДЕНТОВ БИБЛИОТЕЧНО-ИНФОРМАЦИОННОГО ОТДЕЛЕНИЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Содержание образования определяет социальный облик личности современника. Современные исследователи проблем образования пришли к выводу, что личность сегодня должна овладеть совокупностью культур народов мира, чтобы ориентироваться во всем мировом образовательном пространстве[1]. Этого требует интенсивный процесс информатизации жизнедеятельности народов мира, всего мирового сообщества. Отсюда следует вывод, что современное образование подрастающего поколения должно быть поликультурным, т. е. представлять собой совокупность культур народов мира.

В настоящее время политика многонационального государства России направлена на возрождение патриотического воспитания и дружбы народов России со всеми народами мира. Для этого требуется поликультурное содержание образования в школе и в вузе, стало быть, и в библиотеках разных типов.

В Дагестанском государственном университете общекультурная и гуманитарная подготовка студентов является необходимым элементом в становлении специалистов любого профиля. Пронизанность идеей гуманизма всех видов специальных дисциплин, иллюстрации примерами из социально-экономической и духовной жизни народов мира, и в частности Дагестана, подбор соответствующих спецкурсов и курсов по выбору – все это профессионально и интеллектуально под-

[1] *Дмитриев Г. Д.* Многокультурность как дидактический принцип // Педагогика. 2000. № 10. С. 3–12.